# Са спадзяваннем на лепшае

Стан пацярпелага ў Турцыі беларускага дыпламата — стабільна цяжкі

Пра гэта журналістам паведаміў **міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ:**

«У сераду каля 20 гадзін вечара саветнік па пытаннях бяспекі і адміністрацыйна-прававых пытаннях Пасольства Беларусі ў Турцыі Аляксандр Паганшаў вяртаўся дамоў разам з сынам. У пад'ездзе дома адбылося сутыкненне з былым вайскоўцам. Маем інфармацыю, што ён стаяў на ўліку ў псіханеўралагічнай медыцынскай установе, быў псіхічна неўраўнаважаны. Ён стрэліў 4-5 разоў, наш саветнік быў цяжка паранены».

Уладзімір Макей з удзячнасцю падкрэсліў, што турэцкі бок на надзвычайнае здарэнне адрэагаваў імгненна, дыпламат быў дастаўлены ў бальніцу і прааперыраваны.

«Дзякуй богу, гэтыя чатыры кулі не зачапілі жыццёва важных органаў, пасля складанай аперацыі ўрачы прыступілі да вываду яго з рэанімацыйнага стану. Спадзяёмся, што ўсё абыдзецца добра», — падзяліўся міністр.

Па папярэдняй ацэнцы, ніякай палітычнай падаплёкі ў надзвычайным выпадку, на погляд міністэрства, няма. **Міністр замежных спраў Турцыі Меўлют ЧАВУШАГЛУ** адразу звязаўся з беларускім калегам і праінфармаваў аб здарэнні, паабяцаў, што будзе зроблена ўсё магчымае для расследавання і для выратавання дыпламата

Руплівае расследаванне павінна даць агульную карціну адносна прычын таго, што здарылася.

«Магчыма, усё гэта звязана з нейкім незадавальненнем злачынца паводзінамі дзяцей, якія гулялі на панадворку. Падобна да таго, што адбыўся псіхалагічны ўсплёск, які прывёў да такога выніку. Давайце дачакаемся афіцыйных вывадаў», — адзначыў Уладзімір Макей.

Словы спачування выказаў беларускаму боку і **міністр замежных спраў Латвіі Эдгар РЫНКЕВІЧС,** сустрэча з якім адбылася ўчора ў беларускім МЗС.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# МУЗЫЧНАЯ ПАЎЗА НА ЖНІВЕ

## Як у ААТ «Белавежскі» настрой механізатарам узнімаюць

**Земляробы «Белавежскага» з Камянецкага раёна заўсёды ставяць рэкорды. Вось і на сёлетнім жніве шафёр ААТ Міхаіл Кучко перавёз з палёў дзве тысячы тон збожжа. Першым у раёне, вобласці і краіне! З гэтай нагоды яго павіншавалі старшыня райвыканкама Валянцін Зайчук, намеснік старшыні аблсельгасхарчу Віктар Бяссілка, дырэктар гаспадаркі Аляксандр Дунькові, прадстаўнікі прафсаюза, таварышы па працы. Вядома, былі прэміі, падарункі і песні самадзейных артыстаў.**

Але песнямі, танцамі, добрым словам падчас абедзеннага перапынку тут прывячаюць не толькі перадавікоў, але і ўсіх працаўнікоў жніва. Даўняя традыцыя, усталяваная былым кіраўніком Юрыем Марозам, падтрымліваецца і зараз. «Чалавек працуе ў гэты час ад цямна да цямна. Выходзіць з хаты рана і прыходзіць позна ўвечары, калі дзеці ўжо спяць. Яму ж няма часу гартаць стужку навін у інтэрнэце, нават пацікавіцца справамі свайго пасёлка. Ён бачыць перад сабой гадзін дванаццаць адны толькі каласы, — кажа **старшыня прафкама гаспадаркі Валянцін СУПРУНОВІЧ.** — Гэту манатоннасць не вельмі лёгка трываць. Таму, вядома, кожнаму прыемна, калі падчас абеду з ім пагавораць, пацікавяцца справамі, настроем, артысты заспяваюць добрую песню. У нас так заведзена, што чалавек працы карыстаецца павагай. Маленькі канцэрт і ёсць адно з праяўленняў павагі».

Звычайна музычны дэсант на поле арганізуе дырэктар Дома культуры Ірына Герасімук. Работнікі ўстановы



Спявае Васіль ПАЛОКА.

культуры з задавальненнем едуць на ўборку, радуюць сваім мастацтвам працаўнікоў. І не толькі штатныя работнікі, такія як Юлія Логвін. Удзельнікі самадзейнасці падтрымалі добрае пачынанне. Скажам, Васіль Палока працуе трактарыстам на мясакамбінаце, а ў свой выхадны альбо пасля змены з задавальненнем выязджае на поле, каб заспяваць. Андрэй Ягові, інжынер-механік аддзялення «Каралін», пры любой магчымасці падключаецца да мабільнай агітбрыгады.

Дырэктар ДК Ірына Герасімук сказала, што была вельмі рада ў мінулую суботу, калі віншавалі перадавіка Міхаіла Кучко. Асабліва было прыемна, калі пасля атрымання падарункаў ён асобна падзякаваў за песні. «Лічым, што робім свой унёсак у агульную справу ўраджаю. Мы ж разумеем: будуць ісці паспяхова справы ў гаспадарцы — будзе падтрымка аб'ектаў культуры, адукацыі, сацыялкі».

А ўборка ў ААТ «Белавежскі» падыходзіць да фінішнай прамой. На пачатак тыдня было скошана 87 працэнтаў збожжавых, на канец тыдня артысты плануюць заспяваць дажынкавыя песні. Хлебаробы атрымалі каля 43 цэнтнераў збажыны з гектара — для сёлетняга складанага лета нядрэнны вынік.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*

## КАЛІ ЁСЦЬ ПЫТАННІ

**Іх можна задаць падчас чарговых прамых тэлефонных ліній, якія адбудуцца 27 ліпеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 у суботу па званкі адказваюць:**

старшыня БРЭСЦКАГА абласнога Савета дэпутатаў Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні — выконваючы абавязкі старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алёйзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

## У выхадныя спякота вернецца

**На гэтым тыдні ў Беларусі ідуць дажджы, і слупок тэрмометра вагаецца ў асноўным каля адзнакі ў 20—25 градусаў цяпла.**

Гэта адпавядае кліматычнай норме. Але ўжо з суботы на нашу краіну пачне накатваць хваля спякотнага паветра. Падрабязней пра надвор'е расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Надвор'е ў пятніцу будзе мала адрознівацца ад таго, якое панue апошнія дні. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра — ад плюс 21 да плюс 26.

А вось у суботу апаадкаў чакаецца ўжо значна меней. Яны закрануць толькі асобныя раёны. Пацяплее на пару градусаў. У нядзелю сіноптыкі ападкаў ўвогуле не абяцаюць. Уначы тэмпература асабліва не зменіцца — будзе ад 13 да 18 градусаў цяпла. Удзень жа пацяплее яшчэ крыху ў параўнанні з суботай. Па поўдні слупкі тэрмометраў дацягнуцца да 30-градуснай адзнакі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Футбол. Ліга чэмпіёнаў

# Першая частка супрацьстаяння

Футбалісты БАТЭ абыгралі нарвежскі «Русенборг» з лікам 2:1 у першым матчы 2-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў

**Лік быў адкрыты ўжо на пятай хвіліне, калі Ігар Стасевіч рэалізаваў пенальці. Аднак праз 20 хвілін футбалісты нарвежскага клуба вярнулі раўнавагу — 1:1. Пасля перапынку гульцы БАТЭ працягнулі востра атакаваць, і на 52-й хвіліне Максім Скавыш вывеў БАТЭ наперад.**



— Вельмі цяжкі матч. Мы гулялі з сапернікам даволі высокага ўзроўню. Нарвежскі клуб — добра навучаны і згуртаваны калектыў, які здольны гуляць на высокім узроўні, — пракаментаваў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксей БАГА.** — У такім матчы не бывае дробязяў, неабходна ў кожным эпізодзе дзейнічаць з самааддачай. Пасля ўдалага пачатку сустрэчы мы павялі 1:0, але гол у адказ даказаў, што «Русенборг» здольны востра атакаваць. Другі гол у вароты нарвежцаў, на мой погляд, надаў упэўненасці футбалістам БАТЭ і зняў псіхалагічнае напружанне. Гэта толькі першая частка, упэўнены, у матчы ў адказ у Тронхейме праз тыдзень нам будзе няпроста. Тым не менш перамога над такім апанентам — яшчэ адна старонка ў гісторыі нашага клуба.

Паядынак у адказ футбалістаў БАТЭ з нарвежскім чэмпіёнам адбудзецца 31 ліпеня ў Тронхейме. У выпадку перамогі па суме дзвюх сустрэч над «Русенборгам» футбалісты БАТЭ ў трэцім раўндзе згуляюць з пераможцам пары «Марыбор» (Славенія) — АІК (Стакгольм, Швецыя). Няўдачнік супрацьстаяння чэмпіёнаў Беларусі і Нарвегіі пяройдзе ў другі па рангу кантынентальны турнір — Лігу Еўропы — і ў 3-м крузе кваліфікацыі згуляе з клубам «Сараева» з Босніі і Герцагавіны.

Адзначым, што нарвежскі «Русенборг» з'яўляецца 11-разовым удзельнікам групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў. Найбольш значных поспехаў у самым прэстыжным клубным турніры клуб дамагаўся ў сярэдзіне і канцы 90-х.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Медвядчук: «Апазіцыйная платформа» дапаможа прэзідэнту Зяленскаму прыняць закон аб статусе Данбаса

Партыя «Апазіцыйная платформа — За жыццё» гатова дапамагчы прэзідэнцкай партыі «Слуга народа» ўнесці змены ў канстытуцыю адносна статусу Данбаса, заявіў кіраўнік палітрады гэтай партыі Віктар Медвядчук.

Пры гэтым палітык удакладніў, што партыя знаходзіцца ў апазіцыі да дзеючай улады. «Але дзеля міру мы гатовы падтрымаць прэзідэнцкую партыю», — дадаў Медвядчук. Ён лічыць, што «Апазіцыйная платформа — За жыццё» разам са «Слугой народа» можа ўнесці змены ў канстытуцыю, таму што дзве будучыя фракцыі ў Радзе разам набіраюць больш за 300 галасоў, неабходных для канстытуцыйных змен. «Калі для «Слугі народа» будзе прыярытэтам мірнае ўрэгуляванне сітуацыі ў Данбасе, мы гатовы ім дапамагчы», — падкрэсліў Медвядчук.

### Банкі ў Швейцарыі пачалі выдаваць крэдыты па адмоўнай стаўцы

Некаторыя банкі Швейцарыі пачалі выдаваць крэдыты інстытуцыянальным пазычальнікам па адмоўнай стаўцы, перадае Bloomberg.

Адзначаецца, што працэнтная стаўка Нацыянальнага банка Швейцарыі ўстаноўлена на ўзроўні мінус 0,75 %. Крэдытныя арганізацыі краіны вымушаны даплочваць Цэнтрабанку за захоўванне залішніх сродкаў. Адмоўныя стаўкі таксама ўстаноўлены ў банках Даніі, Швецыі і Японіі.

Нацбанк Швейцарыі ўжо некалькі гадоў захоўвае працэнтную стаўку на адмоўным узроўні. Кошт швейцарскага франка застаецца высокім, а інфляцыя — нізкай.

У Даніі Нацыянальны банк упершыню ўвёў адмоўную працэнтную стаўку ў 2012 годзе, каб захаваць курс сваёй валюты. У 2016 годзе The Wall Street Journal пісаў, што датчанін, замест таго каб плаціць працэнты па крэдыце, узятым 11 гадоў таму, у апошнім квартале атрымаў ад банка 38 долараў — дзякуючы адмоўнай працэнтнай стаўцы па крэдыце. Выданне адзначыла, што негатыўны бок гэтай сітуацыі заключаецца ў тым, што банкі не плацяць працэнты па большасці ўкладаў, таму грамадзяне ўкладваюцца ў нерухомасць. Аднак, як адзначае газета, у выпадку празмернага росту інвестыцый на рынку нерухомасці краіне можа пагражаць фінансавы крызіс.

### Нацыянальная італьянская латарэя «Супер Эналота» пабіла сусветны рэкорд



Яе джэкпот дасягнуў 195 мільёнаў еўра. Напярэдадні вечарам камбінацыю з шасці лічбаў зноў ніхто не адгадаў.

Ужо на працягу дзевяці месяцаў італьянцы і шматлікія замежныя грамадзяне, якія спецыяльна прыязджаюць у краіну, беспаспяхова спрабуюць стаць мільянерамі. Аднак, мяркуючы па колькасці прададзеных білетаў, азарт ахвотных сарваць куш няўхільна расце.

Білет на поспех у італьянскую латарэю набывалі Джордж Клуні, Элізабэт Хёрлі і Пэрыс Хілтан. Так, Клуні набыў 1000 білетаў нацыянальнай італьянскай латарэі оптам.

Вядома, што многія знакамітасці спрабавалі гуляць у «Супер Эналота», але больш за ўсіх пашанцавала Мадонне. Паведамлялася, што спявачка набыла 100 білетаў падчас свайго сусветнага турнэ 2012 года і выйграла тады прыз на суму €120 000 (Мадонна ахвяравала свой выйгрыш на будаўніцтва школы ў Малаві).

У латарэі могуць прымаць удзел людзі з любога пункта свету пры ўмове, што білет быў набыты на тэрыторыі Італіі.